# КУЛЬТУРА

ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ "ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ"

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 35 (1474)
29 жніўня 2020 г.





Фота Юрыя ІВАНОВА

# У чаканні першага верасня,

## або Чым сёння жывуць ВНУ сферы культуры?

**Першага верасня — не за гарамі. А гэта значыць, што шматлікія навучальныя ўстановы культуры хутка расчыняць свае дзверы для тых, хто прыходзіць сюды ў пошуку новых ведаў. Бо, як казаў Якуб Колас, цытуючы Арыстоцеля, "корань навукі хоць і горкі, але плады яго салодкія". Натуральна, падрыхтоўчыя мерапрыемствы да новага навучальнага года цяпер заканчваюцца і ва ўстановах вышэйшай адукацыі сферы культуры — Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ды ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Што новага пабачаць студэнты ў сценах сваіх alma mater, якія спецыяльнасці былі найбольш запатрабаваны падчас сёлетніх прыёмных экзаменаў, якія чакаюцца змены ў навучанні ў сувязі з неспрыяльным эпідэміялагічным становішчам — пра ўсё гэта ды пра шмат якія іншыя пытанні і праблемы паспрабавалі даведацца журналісты "К".**

Працяг тэмы — **на старонках 2 — 3, 4 — 5.**

Соцыум

## МАЙСТЭРСТВА ПРОДКАЎ І ЦЯПЛО ДРАЎЛЯНЫХ СЦЕН



**Пра тое, як захаваць для нашчадкаў помнікі драўлянага дойлідства, распавядаюць супрацоўнікі беларускага скансэна.**

ст. 6

Суботнія сустрэчы

## БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ З ФРАНЦЫІ



**З Настассяй Лунёвай, якая папулярызуе родную музычную спадчыну ў кантэксце сусветнай, гутарыць карэспандэнт "К".**

ст. 7

Гістарыёграф

## ЯГО ІМЯ — СІНОНІМ СЛОВА "ПАТРЫЁТ"



**Гісторык-архівіст Зміцер Юркевіч раскрывае таямніцы Тадэвуша Рэйтана — героя, чый лёс авеяны легендамі.**

ст. 15


ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"К" інфармуе

# Напярэдадні свята

**На наступным тыдні, 6 верасня, у Бялынічах, што на Магілёўшчыне, адбудзецца традыцыйнае рэспубліканскае свята — Дзень беларускага пісьменства.**

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ



Як запэўніваюць арганізатары форуму, Дзень пісьменства пройдзе з вялікім размахам. На свяце будзе прадстаўлена звыш 100 кніг, якія выйшлі летась у Беларусі. Адбудуцца сустрэчы пісьменнікаў з жыхарамі горада, прэзентацыі выданняў, фотасесіі і многія іншыя мерапрыемствы. Як і заўжды, на ўрачыстасцях агучаць вынікі Нацыянальнай літаратурнай прэміі.

Акрамя таго, адбудзецца традыцыйны круглы стол, які аб'ядnae творцаў Беларусі і замежжа — Украіны, Расіі, Малдовы, Латвіі, Літвы ды іншых краін. Пісьменнікі абмяркуюць тэмы ўплыву друкаванага слова на свядомасць людзей. Падчас працы круглага стала плануецца відэасувязь з Нацыянальнай акадэмічнай бібліятэкай Казахстана.

Нагадаем, што Дзень беларускага пісьменства праводзіцца штогод у першую нядзелю верасня. Канцэпцыя свята прадугледжвае паказ адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа, адлюстраванне гістарычнага шляху пісьменства і друку ў Беларусі. Традыцыйна Дзень беларускага пісьменства праходзіць у гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання.

К

## Убачыць імкненні праз літару

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе мастацкая выстава "Мая літара", прымеркаваная да Дня ведаў. Яна аб'ядноўвае работы мастакоў сталічных арт-студый "Зебра" і "Зебрык" рознага ўзросту.**



Побач з працамі сёлетніх навучэнцаў — работы тых, хто скончыў арт-студыю 5 — 7 гадоў таму, атрымаў мастацкую адукацыю і набыў творчыя прафесіі. У экспазіцыі — вольны набор выяў літар кірылічнага і лацінскага алфавітаў. Выстава спалучае ўласна мастацкія работы і фотаздымкі, на якіх акрамя самога твора-малюнка можна ўбачыць яшчэ і яе аўтара. Творы дэманструюць вольныя асацыяцыі з той ці іншай літарай. Кожны аўтар — са сваімі спадзяваннямі, густамі і марамі, кожны — са сваёй літарай. Аб'ядноўвае работы агульная ідэя — праз літару паказаць уласныя імкненні, зацікаўленасць, свет і светапогляд.

Наведаць выставу можна ў галерэі "Мабільная" да 1 лістапада.

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Галоўны рэдактар** — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **намеснік галоўнага рэдактара** — Юрый КАРПЕНКА; **адказны сакратар** — Таццяна ПАШЭНЬКА; **рэдактар аддзела:** Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
**Дырэктар** — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
**першы намеснік дырэктара** — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.**
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2020.
Наклад 2947. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 28.08.2020 у 18.00. Замова 2561.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.



Новы спартыўна-культурны цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

# У чаканні першага верасня,

## або Чым сёння жывуць ВНУ сферы культуры?





Студэнты БДУКіМ на занятках і пасля іх.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

### БДУКіМ ЧАКАЕ ГАСЦЕЙ

Адна з вядучых вышэйшых навучальных устаноў сферы культуры — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў — на сёння цалкам гатовы да пачатку новага навучальнага года.

— Чакаем 1 верасня сваіх студэнтаў ва аўдыторыях, бо падрыхтоўка да новага навучальнага года ў нас ужо завяршылася, — адзначыў "К" прарэктар БДУКіМ па навуковай рабоце, кандыдат філасофскіх навук, прафесар Віктар Языковіч. — Да таго ж, гэты год у нас своеасаблівы — мы будзем святкаваць 45-годдзе з часу заснавання нашай ВНУ.

Напрыклад, сярод шэрага святочных мерапрыемстваў, якія запланаваны ў БДУКіМ з нагоды знамянальнай даты — правядзенне Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў другім паўгоддзі бягучага года. Прадстаўнічы навуковы форум пад назвай "Культура Беларусі: рэаліі і сучаснасць", як чакаецца, збярэ сотні навукоўцаў як з нашай краіны, так і з дзяржаў блізкага і далёкага замежжа.

— Праўда, пакуль што невядома, у якім фармаце пройдзе канферэнцыя: у звычайным ці дыстанцыйным, — кажа Віктар Языковіч. — Будзем глядзець па развіцці сітуацыі з каранавірусам, з эпідэміялагічнай сітуацыяй у Беларусі.

Дадам, што на сёння ўжо здадзены ў друк нумар "Веснік БДУКіМ", дзе надрукаваны віншаванні з нагоды 45-годдзя ўніверсітэта прадстаўнікоў навуковай супольнасці Беларусі, кіраўнікоў універсітэтаў шэрагу краін замежжа. Натуральна, пройдуць і іншыя маштабныя мерапрыемствы і акцыі, якія засведчаць і пацвердзяць важнасць ВНУ сферы культуры не толькі для нашай краіны, але і далёка за яе межамі.

### СУЧАСНЫ ЦЭНТР І СТАРАДРУКІ

Да слова, адна з галоўных падзей новага навучальнага года — адкрыццё спартыўна-культурнага цэнтра Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Балазе, эпапея з узвядзеннем гэтага будынка была доўгая і працяглая ў часе.

— На працягу ўсяго часу працы ўніверсітэт адчуваў патрэбу ва ўласных спартыўнай і культурна-відовішчнай пляцоўках, — зазначыў "К" начальнік спартыўна-культурнага цэнтра БДУКіМ Дзмітрый Купрыянюк. — Так, для правядзення заняткаў па фізічнай культуры і эстрадным майстэрстве ўніверсітэту ўсе гэтыя гады даводзіцца штогод арандаваць памяшканні. І да сёння ва ўніверсітэце не было ні сваёй спартыўнай залы, ні канцэртнай пляцоўкі.

Будынак на вуліцы Рабкораўскай, у якім планавалася размясціць СКЦ, пачалі ўзводзіць яшчэ ў далёкім 2007 годзе і павінны былі завяршыць у 2011-м. Але, на жаль, будынак патрапіў у лік даўгабудаў з-за праблем з фінансаваннем. Працы на аб'екце аднавіліся некалькі гадоў таму.

— У гэтым годзе, як вы ведаеце, БДУКіМ спаўняецца 45 гадоў з дня заснавання, — кажа Дзмітрый Купрыянюк. — Таму ўвод у эксплуатацыю гэтага аб'екта ў юбілейны для ўніверсітэта год дасць магчымасць не толькі знізіць выдаткі на арэнду памяшканняў, але таксама і павысіць якасць спартыўнай і прафесійнай падрыхтоўкі навучэнцаў.

Як адзначыў суразмоўца, у спартыўна-культурным цэнтры БДУКіМ могуць ствараць часовыя творчыя і вытворчыя калектывы: цэнтр сучаснай рэжысуры, студыі, творчыя майстэрні, PR-цэнтр, сектар рэкламы і маркетынгу ды многія іншыя. Удзельнікамі гэтых калектываў стануць студэнты БДУКіМ. Усё гэта з'яўляецца рэальным прыкладам рэалізацыі ва ўніверсітэце прынцыпу практыка-арыентаванага навучання.

— У нас ужо ёсць вялікія планы на выкарыстанне гэтай пляцоўкі: ад арганізацыі на яе базе адукацыйнага працэсу (заняткаў па фізічнай культуры, практычных заняткаў творчых кафедраў факультэта музычнага мастацтва і факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва) да рэалізацыі новых творчых праектаў рознай накіраванасці, — кажа Дзмітрый Купрыянюк. — Гэта будзе самым галоўным падарункам для нас у гэтым годзе!



Выкладчыкі і студэнты ўніверсітэта падчас суботніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя таго, як зазначыў у размове з “К” прарэктар па навуковай рабоце Віктар Языковіч, менавіта ў спартыўна-культурным цэнтры плануецца размясціць музей універсітэта, дзе будуць прадстаўлены не толькі разнастайныя фота і дакументы, што сведчаць пра багатую гісторыю БДУКіМ, але і музычныя інструменты, старадаўнія кніжныя фаліянты і іншыя “цікавосткі” матэрыяльнай культуры беларусаў.

### КАМПАНІЯ ПРАЙШЛА ПАСПЯХОВА

Не магу таксама не расказаць крыху і пра сам БДУКіМ ды найбольш папулярныя спецыяльнасці і факультэты ўстановы адукацыі. Так, у структуру ўніверсітэта на сёння, як вядома, уваходзіць пяць факультэтаў, а падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на I ступені вышэйшай адукацыі вядзецца па 12 спецыяльнасцях, 26 напрамках спецыяльнасцей і 15 спецыялізацыях. Усяго ва ўніверсітэце навучаецца каля чатырох тысяч студэнтаў на дзённай і завочнай формах атрымання адукацыі.

— Адзначу, што факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці — адзін з самых папулярных сярод абітурыентаў, — расказала мне начальнік вучэбна-метадычнага аддзела БДУКіМ Святлана Шпарло. — Сёння на названым факультэце навучаецца каля 900 студэнтаў, а яго выпускнікі працуюць у сферах канцэртна-гастрольнай, культурна-дасугавай, спартыўна-турыстычнай і санаторна-аздараўленчай дзейнасці, у кінапракаце, індустрыі вольнага часу, рэкламе, выяўленчым, тэатральным, музейным мастацтве, СМІ, радыё і тэлебачанні.

Карацей, гэта спецыялісты шырокага профілю, якія так неабходны сёння не толькі ў Мінску ці абласных цэнтрах нашай краіны, але і ў раёнах Беларусі. Іншае пытанне — ці даязджаюць гэтыя выпускнікі да раённых устаноў культуры? Як сведчыць мой вопыт камандзіровачных выездаў, такое здараецца не заўсёды і не ўсюды. Але, мабыць, гэта тэма для зусім іншага артыкула.

Што да сёлетняй прыёмнай кампаніі, дык, па словах Святланы Шпарло, на ўсе спецыяльнасці ўніверсітэта было прынята 692 абітурыенты, з іх на дзённую форму навучання — 457, на завочную — 235.

— Папулярнасцю ў абітурыентаў, якія паступаюць на дзённую форму атрымання адукацыі, карысталіся спецыяльнасці “Мастацтва эстрады (спевы)”, “Культуралогія”, “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”, “Харэаграфічнае мастацтва”, — адзначыла суразмоўца. — Дадам, што спецыяльнасці “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” ды “Харэаграфічнае мастацтва” былі запатрабаваныя абітурыентамі і на платнай форме атрымання адукацыі.

Нягледзячы на тое, што ў грамадстве сёння склалася ўражанне, што ў БДУКіМ паступіць даволі лёгка, лічбы сённяшняй прыёмнай кампаніі гавораць пра іншае. Так, напрыклад, за права паступіць на спецыяльнасць “Культуралогія (менеджмент рэкламы і грамадскіх сувязяў)” сёлета змагаліся чатыры чалавекі на адно месца, а на спецыяльнасць “Мастацтва эстрады (спевы)” — тры чалавекі на адно месца. Высокія конкурсы былі і на іншыя спецыяльнасці. Таму, скажам, самым высокім прахадным балам на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі аказаўся прахадны бал на спецыяльнасць “Культуралогія” — ажно 316 балаў.

— Што да завочнай бюджэтнай формы атрымання адукацыі, дык тут найбольш запатрабаванай сярод абітурыентаў была спецыяльнасць “Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)”, — адзначыла Святлана Шпарло. — На паступленне сюды прэтэндавала 2,1 чалавекі на адно месца.

Дарэчы, самым высокім прахадным балам на завочную бюджэтную форму атрымання адукацыі аказаўся прахадны бал на спецыяльнасці “Сацыяльна-культурная дзейнасць” і “Рэжысура свят (народныя)” — 310 і 309 балаў адпаведна. І гэта, мабыць, цалкам заканамерна, бо сёння рэжысёраў, якія могуць паспяхова ставіць народныя святы, ці спецыялістаў, што прафесійна займаюцца сацыяльна-культурнай дзейнасцю ў рэгіёнах, на жаль, не так многа, што, натуральна, і прымушае кіраўнікоў Дамоў ці Цэнтраў культуры накіроўваць сваіх спецыялістаў у Мінск для атрымання вышэйшай адукацыі.

■■■

Як адзначаецца на сайце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, за перыяд існавання ўстановы больш за 30 тысяч маладых спецыялістаў атрымалі тут дыпломы спецыяліста. Магу з упэўненасцю сцвярджаць, завітаўшы шматкроць амаль што ў кожны раён Беларусі, што кожны, хто скончыў БДУКіМ — сапраўдны спецыяліст з вялікай літары, якога вельмі цэняць і шануюць у любым куточку нашай краіны, ад Дрыбіна да Свіслачы і ад Пінска да Верхнядзвінска. І менавіта з дапамогай такіх высокакласных спецыялістаў сёння ў рэгіёнах ідзе паступовы і натуральны працэс фарміравання, станаўлення і развіцця беларускай культуры ва ўсіх яе адметнасцях і праявах.

К

Фота Юрыя ІВАНОВА

Працяг тэмы – на старонках 4 — 5

На маю думку...

# Няспыннасць жыцця

**Днямі, “гартаючы” інтэрнэт, патрапіў на такое відэа. Мастак, даволі вядомы, з ліку тых, каму, на маю думку, можна даваць Дзяржаўную, Нацыянальную ці якую іншую прэстыжную прэмію і нават не за канкрэтны твор, а за комплекс творчых дасягненняў і відавочны ўнёсак у развіццё беларускага мастацтва, выступае на адным з мітынгаў. Трымаючы ў правай руцэ мікрафон, а левую пафасна ўзняўшы над галавой, мастак фактычна дзякуе тым, хто нядаўна зрабіў краіне вельмі балюча. І наэлектрызаваны натоўп у адказ загіпнатызавана скандуе “Спа-сі-бо! Спа-сі-бо! Спа-сі-бо!”**



Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Творчыя асобы — людзі эмацыйныя (без гэтага творчасць проста немагчымая), ды яшчэ большую частку жыцця праводзяць у майстэрні сам насам з палатном ці аркушам паперы. Бывае, што трапіўшы ў нязвыклую сітуацыю (а мітынговая стыхія менавіта з гэтага шэрагу) могуць сказаць ці ўчыніць што-небудзь такое, за што потым будзе сорамна. Ва ўсялякім выпадку, цяжка зразумець творцу, які ўхваляе, прычым публічна, неабгрунтавана-брутальнае вырашэнне праблем. Бо мастак, незалежна ад сваіх палітычных сімпатый, павінен быць на баку святла.

Паколькі да гэтага моманту мае стасункі са згаданай асобай былі амаль сяброўскія, я даслаў ёй sms-ку, у якой параіў, беручы да ўвагі драматычную сітуацыю, думаць, перш чым гаварыць. Адказ быў: “Я с народом. А ты — дурак! И подумай, что вы все творите!” “Мы все”, трэба думаць, гэта тыя, хто “не с народом”.

Я не юрыст, каб даваць прававую ацэнку таму, што рабілася на вуліцах, у пастарунках і вязніцах пасля закрыцця выбарчых участкаў. Гэтым ужо займаюцца на прафесійным узроўні зусім іншыя людзі, што працуюць са сведчаннямі пацярпелых. Я ўвогуле пра іншае. Паспрабую паглядзець на падзеі, што зараз хваляюць усіх, у нейкім сэнсе, з культуралагічнага глядзішча.

Здаецца, сёння, калі мінула амаль тры дзесяцігоддзі з моманту ўсталявання ў краіне суверэнных атрыбутаў, у Беларусі існуюць дзве розных плыні, якія, на жаль, нярэдка суадносяцца як паралельныя светы. Адна — выхавана на экстрыме: палітычным, сацыяльным, эканамічным, які прадугледжвае надзвычайныя паўнамоцтвы і звыклае выкарыстанне хірургічнага нажа нават у тых выпадках, калі можна абысціся ашчаджаючай тэрапіяй. Людзі, якія звышкансерватыўна (а можа, і сюркансерватыўна) трымаюцца гэтых поглядаў, нават чамусьці не могуць уявіць, што стаўленне дзяржавы да грамады можа быць нейкім іншым, акрамя як патэрналісцкім. Нагадаю, патэрналізм — гэта сістэма стасункаў, пры якіх улады забяспечваюць тыя ці іншыя патрэбы грамадзян, а грамадзяне ў абмен на гэта дазваляюць уладам дыктаваць мадэлі сваіх паводзін, як публічных, так і прыватных. Больш за тое, нават гіпатэтычнае пераразмеркаванне ўладных паўнамоцтваў унутры дзяржавы, перадача часткі кіраўнічых функцый грамадскай супольнасці выклікае ў такіх людзей цэлую гаму эмоцый — ад занепакоенасці да непрыхаванага жаху. Яны баяцца свабоды, якая, перш за ўсё, стасуецца з ананімнай адказнасцю перад сабой, а значыць, і перад грамадствам. Яны палохаюцца свабоды больш, чым найрадыкальнейшай формы праўлення (вядомай па некаторых краінах Лацінскай Амерыкі). Людзі гэтай плыні трымаюцца за мінулае, як за цягнік, які даўно пачаў набіраць хуткасць, і недзе ў падсвядомасці яны, канешне, гэта самі разумеюць.

На мой погляд, напачатку 90-х такія людзі складалі крытычную масу ў краіне. Але ж сёння, як бачна, асноўную масу беларускай грамады пачалі фарміраваць іншыя людзі і нават іншыя пакаленні, якія выгадоўваліся і набіралі моц у суверэннай дзяржаве. Тобок ужо пасля таго, як 25 жніўня 1991 года Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі набыла статус канстытуцыйнага закону. Жыццё ёсць жыццё, яно няспынна рухаецца наперад, і яго не спыніць і не стрымаць.

К

# Жанчыны ўратуюць свет

**Кожны дзень пад вокнамі майго рабочага кабінета сігналяць машыны. Яны вітаюць людзей, — што выстройваецца штодня каля будынка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**



Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Пераважная большасць з іх — жанчыны. Менавіта яны сёння з’яўляюцца выразным сімвалам драматычных падзей, пра якія гавораць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі.

Жанчыны выходзяць на вуліцы і плошчы сваіх гарадоў, стаяць каля дарог, махаюць кветкамі мінакам і аўтамабілістам. Яны мякка, але непахісна выступаюць супраць гвалту, прапануюць распачаць у грамадстве дыялог, адмовіцца ад брутальных падыходаў пры вырашэнні пытанняў, звярнуцца да межаў, пераходзіць якія ні ў якім разе было немагчыма.

Жанчыны, як вядома, складаюць большасць у агульным шэрагу супрацоўнікаў сферы культуры. Чаму так атрымалася — гаворка для іншага артыкула. Але відавочна гэтая большасць сёння выступае за правы быць пачутым, а таксама патрабуе вызвалення ўсіх затрыманых ды прававой ацэнкі бязмежнага ўжывання сілы.

“Я не падзяляю вашых меркаванняў, але гатовы памерці за ваша права іх выказваць”. Гэтае выслоўе яшчэ адной жанчыны, англійскай пісьменніцы Эвелін Хол, якое памылкова прыпісваецца Вальтэру, было напісана ў далёкім 1906 годзе. Але яго цалкам можна перанесці і на сённяшнія падзеі ў Беларусі. Словы “дыялог”, “свабода меркаванняў і думак”, “талерантнасць”, “спагада”, “мір” — усе яны не пустыя словы, ад якіх можна адмахнуцца. І менавіта беларускія жанчыны, у тым ліку — работнікі сферы культуры, гавораць гэтыя словы сёння так пранікнёна і настойліва.

Што ж, гэта толькі яшчэ раз кажа пра тое, што беларускія жанчыны — самыя лепшыя ў свеце. Кажу гэта з разуменнем таго, што, магчыма, мае словы пададуцца камусьці пафаснымі. Але, працуючы ўжо не першы год у “Культуры”, я, падчас сваіх камандзіровачных выездаў, амаль заўсёды што ў райвыканкамах, што ў Дамах культуры, што ў бібліятэках ці ДШМ гутарыў зазвычай з імі, беларускімі жанчынамі. З тымі, якія і ўчора, і сёння, і заўтра вялі і будуць весці за сабой дзяўчынак і хлопцаў, навучаючы іх ці то гранню на музычных інструментах, ці то спевам, ці то любові да чытання. Навучаючы іх любові, якая, як вядома, ратуе свет, і кажучы пра тое, што гвалт ніколі не змогуць заглушыць голасу дабрыні, міласэрнасці і спагады.

Таму і сённяшнія падзеі, у якіх так выразна бачна жаночае аблічча, цалкам невыпадковыя. Яны натуральныя, як для ўсіх беларускіх жанчын, так і для ўсіх нас, для мужчын. Бо сімвалізм мудрай жаночай пазіцыі ў гэты няпросты час вызначае ключавыя сэнсы, якія ўвасабляюць не вуліцу, а краіну — Беларусь.

Так, гэтага можа і не быць. Але ж тады наўрад ці атрымаецца сапраўднае развіццё ва ўсіх сферах, а інвестыцыі, творчасць і поспех застануцца толькі прыгожымі словамі. “Людзьмі звацца” — гэта не проста радкі з верша класіка беларускай літаратуры, а тоесныя ментальныя рэчы, неабыякавыя для беларускага народа, які жадае, каб яго не толькі пачулі сёння, але чулі заўсёды.

К

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ